БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 9 красавіка 1998 года, чацвер, № 6 (1779)

Сёлета спаўняецца 40 гадоў механіка-матэматычнаму факультэту БДУ. Нагадаем, што ўтварыўся ён у 1958 годзе пасля падзелу фізіка-матэматычнага факультэта на два самастойныя. У 1975 годзе ў сувязі з адкрыццём спецыяльнасці "механіка" матэматычны факультэт быў перайменаваны ў механіка-матэматычны. Шчыра віншуем студэнтаў, выкладчыкаў, усіх супрацоўнікаў, выпускнікоў факультэта!

НАШ СЁННЯШНІ ВЫПУСК ПРЫСВЯЧАЕЦЦА ЮБІЛЕЮ. НА 3-Й І 4-Й СТАРОНКАХ МЫ РАСКАЖАМ ВАМ ПРА ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СТУДЭНТАЎ МЕХМАТА, ПРА ТОЕ, ЯК ЖЫВЕ ФАКУЛЬТЭТ ЦЯПЕР.

Дарэчы, 25 красавіка адбудзецца Дзень механіка-матэматычнага факультэта.

АФІЦЫЙНА

РАЗВІТАЯ НАВУКА – АБЛІЧЧА УНІВЕРСІТЭТА

2 красавіка адбыўся Вучоны савет універсітэта, на якім была заслухана грунтоўная і дакладная справаздача прарэктара па навуковай рабоце

Сяргея Кімавіча Рахманава "Аб навукова-даследчай рабоце за 1997 год".

У справаздачы было адзначана, што Беларускі дзяржаўны універсітэт, які з'яўляецца вядучай навучальнай установай у нацыянальнай сістэме адукацыі Беларусі і адным з буйнейшых навуковых цэнтраў, выконвае шырокі спектр даследаванняў у розных сферах прыродазнаўчых і гуманітарных навук. У новых эканамічных умовах навуковая сфера БДУ значна рэфармуецца ў эвалюцыйным рэжыме. Рыхтуючы кадры вышэйшай кваліфікацыі, універсітэт працягваў правядзенне даследаванняў па прыярытэтных накірунках навукі ў рамках дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм, дзяржаўных праграм фундаментальных даследаванняў, міжвузаўскіх і універсітэцкіх праграм, фондаў фундаментальных даследаванняў і інфарматызацыі. Распрацавана і пачала рэалізоўвацца канцэпцыя развіцця навукі універсітэта, з'арыентаваная на паступовае прыданне навукова-даследчай рабоце інавацыйнага характару і на інтэграцыю навукі і адукацыі.

У 1997 годзе ў складзе БДУ ў якасці суб'ектаў навукова-даследчай работы дзейнічалі 4 інстытуты, Нацыянальны навукова-вучэбны цэнтр фізікі часціц і высокіх энергій, Навукова-даследчы цэнтр маніторынгу азонасферы, ліцэй. Найбуйнейшай структурай з'яўляецца навукова-даследчая частка БДУ. Яна ўключае ў сябе 126 кафедраў, 52 навукова-даследчыя лабараторыі пры факультэтах і кафедрах, 5 цэнтраў — 'Навукова-інжынерны цэнтр, Цэнтр інфармацыйных тэхналогій, Цэнтр сацыялагічных і палітычных даследаванняў, Цэнтр маркетынгавых даследаванняў, Цэнтр праблем развіцця адукацыі. У 1997 годзе распачата фарміраванне ВНВА і адаптацыя НВА "Комплекс" у складзе БДУ.

Як адзначыў дакладчык, агульная колькасць штатных супрацоўнікаў універсітэта, занятых у навуковай сферы ў мінулым годзе, складала 3097 чалавек (у іх ліку 233 доктары навук і 1144 кандыдаты). Па плану навукова-даследчай работы выконвалася 1020 тэм.

Паколькі навука не можа існаваць у адрыве ад іншых сфераў дзейнасці чалавека, добрай характарыстыстыкай працы універсітэцкіх навукоўцаў прагучала паведамленне пра тое, што для выкарыстання ў вытворчасці было перададзена 127, а ў навучальным працэсе — 350 навуковых распрацовак. Атрымана таксама 18 станоўчых рашэнняў па заяўках на вынаходніцтвы, 33 дзейсныя патэнты. Сярод 319 выданняў у мінулым годзе было выдадзена 57 манаграфій, 23 зборнікі навуковых твораў, 185 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, апублікавана 1582 артыкулы і 1667 тэзісаў дакладаў на канферэнцыях. Дарэчы, за мінулы год на базе універсітэта былі праведзены 22 міжнародныя канферэнцыі (семінары, нарады).

У той жа час, у праекце пастановы Вучонага савета па выніках справаздачы аб навукова-даследчай рабоце ў 1997 годзе адзначаецца, што ў навуковай сферы універсітэта маецца шэраг сур'ёзных недахопаў. Сярод іх — слабая арыентацыя навуковых даследаванняў на атрыманне і рэалізацыю канчатковага прадукта, абумоўлены гэтым нізкі ўзровень фінансавання навукова-даследчых работ у большасці навуковых падраздзяленняў і нізкі ўзровень аплаты працы навуковых работнікаў. Часам перашкаджае эфектыўна планаваць навуковыя даследаванні і незадавальняючы ўзровень арганізацыі кіравання навуковай сферай універсітэта. Да частковай нерэалізаванасці навуковага патэнцыялу універсітэта ў галіне падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў прыводзіць і недастатковая ступень узаемадзеяння навуковай і адукацыйнай сферы.

У сувязі з гэтым Савет палічыў неабходным падтрымманне і развіццё ўсімі цывілізаванымі метадамі базы фундаментальных навуковых даследаванняў Белдзяржуніверсітэта і лічыць прыярытэтнай задачай развіццё ўласнай навукова-вытворчай базы, каб

ужо ў 1998 годзе радыкальна павысіць аб'ём фінансавання навуковай сферы БДУ. Для эфектыўнага прасоўвання выкананых у БДУ навуковых распрацовак на рынак вырашана стварыць у бліжэйшы час на базе існуючых структур адзіны маркетынгавы цэнтр, які б функцыянаваў на прынцыпах самаакупнасці. А яшчэ ў адпаведнасці з пратаколам даручэнняў Прэзідэнта РБ А. Р. Лукашэнкі, якія былі дадзены на нарадзе з рэктарамі вышэйшых навучальных устаноў 15 студзеня 1998 года, у 1998-1999 гадах у Белдзяржуніверсітэце будзе праводзіцца эксперымент па стымуляванню працы аўтараў прыкладных даследаванняў у залежнасці ад выніkаў практычнага прымянення іх распрацовак у народнай гаспадарцы.

КОНКУРС

"НАВУКА-98"

Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў аб'явіў конкурс праектаў фундаментальных і пошуковых даследаванняў "Навука-98". Мэта конкурса — фінансавая падтрымка творчых навуковых калектываў і асобных вучоных, якія займаюцца вырашэннем актуальных навуковых праблем у інтарэсах эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі. Заяўкі ад жадаючых атрымаць грант прымаюцца па 8 мая 1998 года ўключна.

Аб'яўлены таксама конкурсы: выдавецкіх праектаў, фінансавай падтрымкі ў арганізацыі рэспубліканскіх і міжнародных навуковых мерапрыемстваў, фінансавай падтрымкі выканаўцаў праектаў Фонду па іх удзелу ў замежных навуковых мерапрыемствах, фінансавай падтрымкі матэрыяльна-тэхнічнай базы навуковых даследаванняў, якія выконваюцца па дагаворах з Фондам. Заяўкі на згаданыя конкурсы падаюцца на працягу года і разглядаюцца штоквартальна.

Конкурс на саісканне грантаў для маладых вучоных (да 33 гадоў) "Навука-98М" будзе аб'яўлены пазней.

Умовы конкурсаў і формы заявачных матэрыялаў можна атрымаць у выканаўчай дырэкцыі Фонду па адрасу: 220072, г.Мінск, пр.Ф.Скарыны, 66, к. 414. Тэлефоны для даведак: 268-57-22, 268-48-90: тэл./факс 239-31-62, а таксама па Інтэрнэту на FTP-серверы Фонду: ftp//fond.bas-net.by/ у працоўныя дні з 9.00 да 17.30.

Ірына ШКЛЯР

ВЕДАЙ НАШЫХ!

ЭЛІТА РЭСПУБЛІКІ

Гарадское паселішча Зэльва 28-29 сакавіка прымала чатырнаццаты чэмпіянат Беларусі па гіравому спорту. Мацнейшыя студэнты БДУ выступалі ў складзе зборнай Мінска, якая перамагла ў камандным першынстве. На другім месцы — Віцебская вобласць, трэцяя — Гомельская.

У вазе 60 кг "срэбра" — у кандыдата ў майстры спорту Андрэя Стальмашонка (фізфак, I курс).

У вазе 70 кг за "золата" ішла жорсткая барацьба паміж вядомым гіравіком Уладзімірам Коцурам з Гомельскай вобласці і нашым Дзмітрыем Барканам (III курс, ФПМ). І Дзмітрый заваяваў медаль вышэйшага гатунку.

У вазе 75 кг Сяргей Гаркуша (I курс, фізфак) быў толькі трэцім.

У катэгорыях 80, 90 і 100 кг пераможцы ўсё тыя ж: майстар спорту Аляксандр Воўк (I курс, юрфак), майстар спорту Алег Сямёнаў (V курс, гістфак) і з гэтых спаборніцтваў таксама ўжо майстар спорту Андрэй Атрашкевіч (III курс, факультэт міжнародных адносін).

У вазе звыш 100 кг Дзмітрый Заплешнікаў (другакурснік юрфака) быў другім.

Вольга КАЗДЗЕРКА

А У НАС! А У ВАС?

І ЮРЫСТЫ КАХАЦЬ УМЕЮЦЬ

У рамках святкавання 200-годдзя з дня нараджэння выдатнага польскага паэта Адама Міцкевіча на юрыдычным факультэце БДУ адбыўся конкурс маладых паэтаў і дэкламатараў "Стихов чарующие строки".

Свае здольнасці дэманстравалі каля трох дзесяткаў юрыстаў, пераважна з першых трох курсаў (старэйшыя чамусьці аказаліся менш актыўнымі... ці менш рамантычнымі?).

Улічваючы, што сапраўдная вясна толькі-толькі пачалася, зусім не дзіўна, што асноўнай тэмай як сваіх, так і чужых вершаў, якія прагучалі падчас выступленняў, было каханне.

Здзіўляе павальная любоў юрфакаўцаў да Шэкспіра (прычым чыталі яго найбольш на мове арыгінала). Магчыма, прыхільнасць тлумачыцца тым, што тэматыка Шэкспіра павінна быць блізкай сэрцу юрыста: што ні твор — то забойствы, то злачынныя змовы, то бойкі і г.д. Юля Міхайлава ўсё ж паспрабавала крыху "разбавіць" гэтае англамоўнае мора кропляй французскай літаратуры і прачытала па-французску славуты верш "Пад мостам Мірабо" Гіёма Апалінэра, дарэчы, беларуса з паходжання.

Але часцей за ўсё, вядома, дэкламаваліся вершы самога Адама Міцкевіча (асабліва ягоны "Сон", які гучаў у розных перакладах некалькі разоў).

Уласныя вершы чыталі Дар'я Лонда, Вераніка Шатохіна, Антон Кельмут, Алеся Майсейчык, Кацярына Стэльмах, Наталля Ігнацюк, Юлія Яжэвіч. Гэтыя моманты імпрэзы выклікалі, натуральна, найбольшую цікавасць аўдыторыі.

А такія паэтычныя сустрэчы, канешне ж, трэба праводзіць часцей. І зусім не абавязкова для гэтага чакаць, пакуль надыдзе чарговая круглая дата. Яны ж дапамагаюць праявіцца схаваным талентам, аб існаванні якіх, магчыма, ніхто і не ведае.

Пры падвядзенні вынікаў журы імкнулася да таго, каб пакрыўджаных не засталося. Увогуле, паэзія — такая справа, у якой вызначыць пераможцаў цяжка. У рэшце рэшт усе ўдзельнікі былі так ці інакш адзначаныя і ўзнагароджаныя. А прызавыя месцы занялі Павел Самадумскі, Дар'я Лонда, Антон Кельмут, Юлія Яжэвіч, Ірына Аўчарэнка, Лідзія Самусенка, Наталля Ігнацюк, Вераніка Шатохіна, Настасся Дарожка і Дзмітрый Лаўцель.

P.S. Акрыленыя поспехам свайго пачынання, юрфакаўцы вырашылі стварыць на сваім факультэце паэтычны клуб! Паводле папярэдняй інфармацыі, яго прэзідэнтам мусіць стаць студэнт 2-га курса Дзмітрый Лаўцель.

Марыя ГРАМЫКА

ПРАБЛЕМА

КАМП'ЮТЭРНАЯ МАТЭМАТЫКА: НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ПАТРАБУЮЦЬ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАДТРЫМКІ

Праблемы ўкаранення найноўшых інфармацыйных тэхналогій ва ўсе сферы жыццядзейнасці абмяркоўваюцца ў грамадстве і на старонках друку ўжо даўно. А цяпер настаў момант, калі дзяржава лічыць неабходным сістэматычна заняцца гэтымі задачамі. Сведчанне гэтаму — сумеснае пасяджэнне Калегій Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях (ДКНТ) і Міністэрства прамысловасці Рэспублікі Беларусь, якое адбылося 27 лютага. Пасяджэнне прысвячалася разгляду праблем выканаанння дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм і задачаў рэспубліканскіх органаў кіравання па фарміраванню новых дзяржаўных, галіновых і рэгіянальных праграм. На пасяджэнні, у прыватнасці, адзначалася неабходнасць надаць больш увагі камп'ютэрным тэхналогіям і ўкараненню іх на прадпрыемствах. У лік прыярытэтных накірункаў на бліжэйшыя два гады была ўключана праграма "Інфармацыйныя і камп'ютэрныя тэхналогіі". У сувязі з гэтым прыемна адзначыць, што ў Белдзяржуніверсітэце не першы год інтэнсіўна вядуцца работы ў гэтым накірунку. Камп'ютэрная матэматыка — тая галіна дзейнасці, пра якую пойдзе гаворка ў гэтым артыкуле, — па праву лічыцца перадавой інфармацыйнай тэхналогіяй, якая выкарыстоўваецца ў навуковых даследаваннях, тэхніцы і адукацыі. Маюцца на ўвазе камп'ютэрныя сістэмы для выканання матэматычных вылічэнняў альбо сістэмы камп'ютэрнай алгебры (СКА).

У Рэспубліцы Беларусь работы па сістэмах камп'ютэрнай алгебры вяліся і вядуцца па трох асноўных накірунках: выкарыстанне універсальных сістэм у навукова-даследчых распрацоўках для выканання грувасткіх сімвальных вылічэнняў; стварэнне спецыялізаваных СКА для вырашэння складаных задач, якія не пад сілу універсальным сістэмам; выкарыстанне СКА ў навучальным працэсе.

Пры гэтым, пачатак выкарыстанню СКА ў навуковых даследаваннях, хутчэй за ўсё, быў пакладзены ў ядзернай і тэарэтычнай фізіцы працай "Приложение аналитических манипуляций с компьютером к процессам тормозного излучения и рождения пар", а механіцы дэфармуемага цвёрдага цела — працай "Методы компьютерной алгебры в трехмерной теории устойчивости прямоугольных пластин".

У некаторых выпадках аб'ём аналітычных пераўтварэнняў настолькі вялікі, што універсальныя сістэмы не ў стане яго выканаць за прымальны час. Для гэтых выпадкаў распрацоўваліся і працягваюць распрацоўвацца спецыялізаваныя СКА пад вызначаныя класы задач. Першая і адзіная ў Беларусі сістэма такога кшталту — СОФУС — была створана ў 1985 годзе і прызначалася для знаходжання асноўных характарыстык груп Лі і Лі-Беклунда, якія дапускаюцца сістэмамі дыферэнцыйных ураўненняў, у прыватнасці газавай дынамікі і Ламе.

У рамках трэцяга накірунку ў Беларускім дзяржаўным універсітэце Юрыем Віктаравічам Пазняком у асноўным курсе "Вылічальныя машыны і праграміраванне", спецкурсах "Аўтаматызацыя навуковых даследаванняў", "Сістэмы аналітычных пераўтварэнняў і іх выкарыстанне падчас рашэння навукова-тэхнічных задач" сістэматычна выкладаліся метады праграміравання ў сістэмах камп'ютэрнай алгебры агульнага прызначэння.

У 1989 годзе выйшаў першы даведачны дапаможнік "Аналитические вычисления в системе Reduce", напісаны Н.І.Гурыным, А.Г.Скамарохавым. А ў 1995 годзе быў выдадзены вучэбны дапаможнік "Аналитические преобразования на ЭВМ в математике и механике", аўтар — Ю.В.Пазняк.

Аднак выкарыстанне згаданых сістэм у навучальным працэсе ВНУ да гэтага часу не стала сістэматычным. На матэматычных факультэтах універсітэтаў наогул адсутнічаюць абавязковыя курсы па метадах камп'ютэрнай алгебры — гэта значыць, па метадах праграміравання ў сістэмах аналітычных пераўтварэнняў на ЭВМ. У той жа час, у Расіі, Германіі, ЗША і многіх іншых краінах надаецца вялікая ўвага навучанню з выкарыстаннем СКА, а таксама агульным курсам па камп'ютэрнай матэматыцы з выкарыстаннем наяўных матэматычных пакетаў (такіх, як Mathematica), здольных рабіць і аналітычныя пераўтварэнні, і лічбавыя разлікі, і графічнае мадэляванне, якія маюць добрую ўзаемасувязь з іншымі сістэмамі, а таксама выхад у лакальныя і глабальныя сеткі.

Адной з задач створанай у Цэнтры інфармацыйных тэхналогій БДУ групы "Сістэмы камп'ютэрнай алгебры і аналізу" з'яўляецца аказанне студэнтам, аспірантам і навуковым работнікам БДУ метадычнай і тэхнічнай дапамогі ў авалодванні сучаснай тэхналогіяй даследчай работы, укараненне сродкаў камп'ютэрнай алгебры ў навучальны працэс і навуковыя даследаванні.

Трэба таксама адзначыць, што аўтары пастаянна прыцягваюць увагу навуковай грамадскасці да праблем, звязаных з выкарыстаннем СКА ў прыродазнаўстве, тэхніцы і адукацыі. Гэта публікацыі ў выданнях "Беларускі універсітэт", "Компьютерные вести", "Республика", працы Другой міжнароднай канферэнцыі "Новыя інфармацыйныя тэхналогіі ў адукацыі".

Яшчэ адным крокам для таго, каб на дзяржаўным узроўні была прыцягнута ўвага да гэтых праблем, з'явіўся ліст па міністра адукацыі В. І. Стражава "Аб новых інфармацыйных тэхналогіях у адукацыі і навуцы на аснове камп'ютэрнай алгебры".

На наш погляд, своеасаблівым прамежкавым вынікам зробленай працы можна лічыць правядзенне першай у рэспубліцы Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Камп'ютэрная алгебра ў фундаментальных і прыкладных даследаваннях і адукацыі", якая прайшла 8-11 снежня 1997 года на базе Белдзяржуніверсітэта.

Абмен меркаваннямі падчас канферэнцыі сведчыць, што важным фактарам устойлівага эканамічнага развіцця заходніх краін з'яўляецца схільнасць іх сістэм адукацыі да пастаяннага ўдасканальвання тэхналогіі ўзнаўлення інжынернага і навуковага патэнцыялу грамадства. Праведзены аналіз дае падставы лічыць, што адной з самых перспектыўных лічыцца тэхналогія, заснаваная на выкарыстанні сістэм з элементамі штучнага інтэлекту, у прыватнасці сістэм камп'ютэрнай матэматыкі. Пры гэтым ступень выкарыстання гэтых сістэм знаходзіцца ў прамой залежнасці ад ступені аснашчанасці грамадства вылічальнай тэхнікай.

Вядучая роля ў гэтым працэсе належыць ЗША, Канадзе, Германіі. У гэтых краінах не толькі ствараюць сістэмы камп'ютэрнай алгебры, але і клапоцяцца аб іх распаўсюджванні і падтрымцы. Штогод выдаецца вялікая колькасць падручнікаў і манаграфій па розных аспектах прымянення сістэм камп'ютэрнай матэматыкі (СКМ). Акрамя таго, у ЗША выходзіць штомесячны бюлетэнь, змест якога цалкам прысвечаны СКМ.

Цяжкое эканамічнае становішча Беларусі не дазваляе займацца стварэннем згаданых высокаінтэлектуальных сістэм, у той час як, напрыклад, у ЗША іх распрацоўкі фінансуюць такія ведамствы, як міністэрства абароны і Нацыянальнае агенцтва па касмічных даследаваннях.

Відавочна, што Рэспубліка Беларусь не можа на цяперашнім этапе дазволіць сабе шматгадовую распрацоўку універсальных СКМ, але цалкам рэальна сёння даць магчымасць хаця б карыстацца гэтымі сістэмамі, ажыццяўляць іх інфармацыйнае напаўненне і ствараць змешаныя сістэмы лічбава-аналітычнага ліку на ЭВМ. Пры гэтым неабходна выкарыстоўваць вопыт, накоплены ў свеце, і на яго аснове праводзіць правільную канцэптуальную палітыку, каб забяспечыць адукаванае кіраванне працэсамі выкарыстання СКМ у адукацыі і навуцы.

Нельга не адзначыць жывую цікавасць да гэтай канферэнцыі з боку студэнтаў, частка якіх прыехала паслухаць лекцыі з іншых гарадоў рэспублікі. І ў гэтым няма нічога дзіўнага. Сённяшнія студэнты ўваходзяць у тую катэгорыю людзей, для якіх праблема авалодвання найноўшымі камп'ютэрнымі сістэмамі з'яўляецца адной з важнейшых, бо нягледзячы на ўзрослыя аб'ёмы інфармацыі падача яе ў нашых навучальных установах застаецца, па вялікім рахунку, на тым жа ўзроўні, што і шмат гадоў таму.

Частка наступнага вялікага этапа работы — стварэнне метадалагічнай базы для прымянення сістэм камп'ютэрнай матэматыкі ў адукацыі — можа ажыццяўляцца шляхам выдання вучэбных дапаможнікаў і зборніка задач па СКМ. У мэтах рэалізацыі гэтага этапа Цэнтрам інфармацыйных тэхналогій Белдзяржуніверсітэта падрыхтаваны праект "Распрацаваць і ўкараніць метадалогію інтэнсіфікацыі інжынернай, прыродазнаўчай і гуманітарнай адукацыі на аснове камп'ютэрнай алгебры", дзяржаўным заказчыкам якога выступае Міністэрства адукацыі. Праект, разлічаны на тры гады, прадстаўлены на разгляд у Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях, і цяпер ад рашэння ДКНТ залежыць, ці атрымаецца перайсці ад шматгадовых дыскусій да рэальнай дзейнасці. Апошнія крокі ў вызначэнні шляхоў развіцця нашай дзяржавы, што ўзгадваліся вышэй, дазваляюць спадзявацца, што праект, які прапаноўваецца, ажыццявіцца ўжо ў 1998 годзе.

Цэнтрам інфармацыйных тэхналогій сумесна з механіка-матэматычным факультэтам БДУ падрыхтаваны таксама праект на 1998-1999 гады "Распрацоўка вучэбна-метадычных комплексаў па сістэмах камп'ютэрнай матэматыкі для прыродазнаўчых і гуманітарных спецыяльнасцяў БДУ", які чакае фінансавання.

У выкладанні матэматычных дысцыплін неабходна ўсебакова выкарыстоўваць кам'ютэрную матэматыку як адну з сучасных інфармацыйных тэхналогій, якая актыўна ўжываецца ў навучальным працэсе універсітэтаў развітых краін свету. Шырокараспаўсюджаныя ў свеце і даступныя ў нашай рэспубліцы магутныя сістэмы камп'ютэрнай матэматыкі дазваляюць пры належным іх выкарыстанні практычна хутка падняць нашую вышэйшую адукацыю на якасна новы ўзровень, які ў вядучых універсітэтах свету ўжо стаў стандартам.

Прыярытэты развіцця, вызначаныя нашай дзяржавай, указваюць на неабходнасць выдзялення дзяржаўных бюджэтных сродкаў на асваенне сродкаў камп'ютэрнай матэматыкі. Бяспрэчна, асваенне і ўкараненне новых тэхналогій патрабуе на пачатковым этапе некаторых дадатковых інвестыцый, асабліва калі ўлічыць прынцыповую неабходнасць (яшчэ, на жаль, не зусім звыклую для нашага грамадства) набываць ліцэнзійныя матэматычныя пакеты і праграмнае забеспячэнне. Аднак зразумела, што эфект ад падобных новаўвядзенняў — як навуковы, так і эканамічны — ужо ў хуткім часе з лішкам акупіць усе фінансавыя затраты.

Ю. І. Варатніцкі, дырэктар ЦІТ БДУ,
С. В. Зямской, малодшы навуковы супрацоўнік ЦІТ БДУ,
А. М. Курбацкі, прарэктар па вучэбнай і інфармацыйна-аналітычнай рабоце,
Ю. В. Пазняк, загадчык НДЛ інфармацыйных сістэм ЦІТ БДУ,
М. М. Шумейка, дырэктар НЦ ФЧВЭ БДУ

ЮБІЛЕІ

Некалькі дзён таму начальнік Упраўлення бухгалтарскага ўліку і фінансаў — галоўны бухгалтар Белдзяржуніверсітэта Валянціна Пятроўна САЛАДУХА святкавала свой юбілей.

Валянціна Пятроўна скончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі ў 1980 годзе, а з мая 1986 года працуе ў БДУ на пасадзе галоўнага бухгалтара. Сапраўды, займацца такімі адказнымі і сур'ёзнымі справамі, як бухгалтэрыя і фінансы найбуйнейшай ВНУ Беларусі, і да таго ж кіраваць вялікім жаночым калектывам — нялёгка, і не кожны здольны гэта рабіць.

Далучаемся да ўсіх віншаванняў, якія гучалі ў адрас імянінніцы. Жадаем моцнага здароўя, шчасця, далейшых поспехаў у працы.

НАДОЕЧЫ

ВЯЛІКАМУ КАРАБЛЮ — ВЯЛІКАЕ ПЛАВАННЕ

1 красавіка (і гэта не жарт) — дзень нараджэння факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ. У гэтым годзе ФПМ адправіўся ў 29-е "плаванне вакол свету" па акіяну ведаў.

Дзень смеху на факультэце асаблівы. Матэматыкі шануюць традыцыі і кожны год урачыста святкуюць дзень нараджэння ФПМ: ладзяць спартыўныя спаборніцтвы, выбіраюць лепшага выкладчыка года па незлічонай колькасці намінацый (самы разумны выкладчык, самы вясёлы, прыгожы, шкодны і г.д.), каманды КВЗ факультэта весяляць праграмістаў на лепшых канцэртных пляцоўках Мінска. Заканчваецца свята на дыскатэцы.

Чарговы дзень нараджэння ФПМ святкаваў у ДК чыгуначнікаў. Жадаючых падзяліць свята ФПМ было так шмат, што рацыянальныя інфарматыкі не прамінулі магчымасці праявіць свае прадпрымальніцкія здольнасці. Нібы па ўзмаху чароўнай палачкі альбо каляровага прынтара, з'явіліся лішнія білеты, якія "заганяліся" па дагаворным кошце. У ФПМ дзесяць шчаслівых лічбаў. "0" — узровень ведаў студэнта; "1" — першага красавіка; "2" — нумар тралейбуса, на якім студэнты інтэрната № 6 кожную раніцу спазняюцца ва універсітэт; "3" — мара студэнта на сесіі; "4" — колькасць спецыяльнасцей на факультэце; "5" — самая запаветная мара ...; "6" — нумар інтэрната ФПМ... І асобна трэба сказаць пра "9" — гэта інтэрнат № 6 пасля святкавання дня факультэта.

Праграмісты не засталіся абыякавымі да вядомага "Тытаніка" (усё ж такі аддалі даніну модзе) і стварылі свой "мультыплікацыйны" варыянт на сцэне ДКЖ. У матэматыкаў усё закончылася "хэпі эндам", таму што "ільдзінка" і "карабель" не сустрэліся — не лёс!

Сапраўды, гэта цудоўна, калі ў вялікага карабля — не вялікае караблекрушэнне, а вялікае плаванне. Папутных вятроў вам, спадары матэматыкі!

Дыяна БАЛЫКА

СПОРТПЛЯЦОЎКА

ДЗЮ-ДО ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

Універсітэцкія жаночая і мужчынская зборныя па дзюдо — у шэрагу наймацнейшых у рэспубліцы. За апошнія дванаццаць гадоў не было таго, каб нашыя хлопцы і дзяўчаты не занялі на вузаўскіх спаборніцтвах прызавыя месцы. Гадоў 5-6 таму на юрыдычным факультэце вучылася амаль уся зборная Беларусі.

Зараз ва універсітэцкіх дзюдаістаў невялікі спад, але яны пад кіраўніцтвам галоўнага трэнера зборнай Мікалая Аляксандравіча Брыткова паранейшаму прымушаюць сябе паважаць.

Чэмпіянаты БДУ па жаночаму і мужчынскаму дзю-до, што праходзілі ў рамках студэнцкай спартакіяды 18-19 сакавіка ў зале барацьбы універсітэцкага спорткомплекса, сабралі шмат гледачоў. Даволі высокі ўзровень спаборніцтваў абумоўліваўся падборам моцных спартсменаў. Амаль усе хлопцы — кандыдаты ў майстры спорту.

У хлопцаў у вазе да 60 кг у фінале сышліся юрыст Міхаіл Семянюк і журналіст Андрэй Кунцэвіч. Апошні перад паядынкам ніяк не мог пазбавіцца думкі, што сапернік мацнейшы і яго шанцы на перамогу мізэрныя. Андрэй, як сапёр, памыліўся толькі аднойчы, прапусціўшы кідок. Але Міхасю гэтага хапіла, каб атрымаць чыстую перамогу.

У вазе да 66 кг мінулагодняму чэмпіёну кандыдату ў майстры спорту Вячаславу Драчуку з 5-га курса факультэта радыёфізікі і электронікі супрацьстаяў кандыдат у майстры спорту Павел Макуха, другакурснік ФПМ. У папярэдніх баях з удзелам Паўла звычайна нічога не было вядома да апошняга моманту, але раптам невядома адкуль браліся сілы ў матэматыка, і перамога даставалася яму. Тое ж было і ў фінале. І Драчук, і Макуха — вартыя чэмпіёнства, але Вячаславу Драчуку давядзецца пакінуць універсітэт толькі віцэ-чэмпіёнам.

У вазе да 73 кг да фіналу дайшлі два любімцы публікі — кандыдат у майстры спорту трэцякурснік радыёфака Аляксандр Чыж і кандыдат у майстры спорту трэцякурснік юрфака Рыгор Барысенка. Барацьба была вельмі напружаная. Чыж — першы, Барысенка — толькі другі.

Найбольш цікавай з'явай у гэтай катэгорыі і наогул у другім дні спаборніцтваў стаў барэц-вольнік з факультэта журналістыкі Павел Капскі. Не ведаючы дасканала тэрміналогіі і правілаў дзю-до, апрануты ў нязвыклае кімано, ніжэйшы за ўсіх сапернікаў, Павел быў самым спрытным. Але суддзя ўвесь час нагадваў, што "тут не вольная барацьба". Таму журналіст стаў толькі пятым.

У вазе да 81 кг першым стаў майстар спорту Андрэй Паўлючэнка (II курс юрфака), да 90 кг — перамог кандыдат у майстры спорту Араз Аліеў (II курс ФМА), да 100 кг — кандыдат у майстры спорту Сяргей Фалейчык (V курс юрфака), звыш 100 кг — кандыдат у майстры спорту Сяргей Бордак (IV курс юрфака). У абсалютнай вагавай катэгорыі перамог студэнт факультэта міжнародных адносін Дзмітрый Каляда.

У агульнакамандным першынстве перамога дасталася юрыстам.

У дзяўчат у вазе да 48 кг пераможцу называлі яшчэ да пачатку спаборніцтваў. Журналістка кандыдат у майстры спорту Кацярына Тузава чатыры гады запар станавілася чэмпіёнкай універсітэта. І ёй ніхто не перашкодзіў стаць пяцікратнай. Каця перамагла лёгка, па-жаночы эфектна.

У вазе да 57 кг проста не пажадала выступаць без відавочных прычын мацнейшая спартсменка універсітэта Алёна Ганчаронак (юрфак, II курс). Юрфаку гэта каштавала першага агульнакаманднага месца. Пераможца ў гэтай катэгорыі — Аляксандра Жылевіч (II курс мехмата).

Апагеем спаборніцтваў стала схватка ў жаночай «абсалютцы» паміж Ганнай Янец і Юліяй Астанінай. Гэта дзве вечныя саперніцы, яны не ўпершыню высвятлялі, хто з іх мацнейшая. Таму бойка была прынцыповай. Астаніна мела ўсе шанцы перамагчы. Яна — вопытны баец, Янец — зусім маладая. Але, памятаеце, «прыйшоў, пабачыў, перамог»? Ганна Янец чыста перамагла сваю саперніцу. Нельга сказаць, што Астаніна менш вартая перамогі. Але трэба змірыцца, што цяпер тытул мацнейшай перайшоў да Ганны Янец.

У агульнакамандным спаборніцтве ў дзяўчат перамог мехмат.

Вольга КАЗДЗЕРКА

Ад вяршынь Каўказа — да высотаў матэматыкі

Анатоль Сямёнавіч Фядэнка — асоба неардынарная. Амаль з першых жа дзён свайго з'яўлення на мехмаце не толькі выкладаў матэматыку: у 1958 годзе ў БДУ ўзнікла секцыя турызму і альпінізму. Шмат гадоў яе ўзначальваў Анатоль Сямёнавіч.

Прафесар Фядэнка падымаўся ў горы Памі-ра, Цянь-Шаня, неаднойчы пераадольваў вяршыні Каўказа, на лыжах прайшоў Урал, Кольскі паўвостраў, Беларусь. Васемнаццацігоддзе сына адзначый пад'ёмам на вышэйшую кропку Еўропы — Эльбрус. На Казбек у 1986 годзе ўзышоў у другі раз — у гонар пяцідзесяцігоддзя пад'ёму на гэтую вяршыню свайго настаўніка А. М. Калмагорава.

Дарэчы, доктар фізіка-матэматычных навук Фядэнка лічыць, што калі б ён не стаў майстрам спорту па горнаму турызму, то не адважыўся б прыступіць і да напісання доктарскай дысертацыі:

— Мехмат увайшоў у маё жыццё паўстагоддзя назад. У 1947 годзе я паступіў на механіка-матэматычны факультэт МДУ і закончыў там аспірантуру ў 1955 годзе. Маімі настаўнікамі былі выдатныя асобы: акадэмік А. М. Калмагораў — дэкан мехмата, акадэмік І. Г. Пятроўскі — рэктар МДУ, акадэмік АПН А. І. Маркушэвіч — куратар майго курса.

У 1955 годзе А. М. Калмагораў параіў мне паехаць працаваць у Беларусь. З таго часу мой лёс непарыўна звязаны з мехматам БДУ.

У жніўні 1976 года я адолеў найвышэйшую кропку Еўропы — Эльбрус. Адразу пасля таго мне прапанавалі пачаць новае ўзыходжанне — на пасаду дэкана мехмата БДУ, на якой я працаваў тры гады.

У гады майго дэканства механіка-матэматычны быў самым буйным факультэтам ва універсітэце. 1978 год быў адзначаны прызнаннем поспехаў мехмата ў галіне навукі і адукацыі. У гэтым годзе супрацоўнікам і выпускнікам факультэта былі прызначаны прэміі: Ленінская — У. П. Платонаву, Дзяржаўная прэмія СССР — А. І. Гаро, Э. В. Кавалевічу, Л. Т. Чупрыгінай, Я. С. Шагідзевічу, Дзяржаўная прэмія БССР — У. І. Крылову, У. В. Бабкову, П.І. Манастырскаму, прэмія Ленінскага камсамола Беларусі — Я.В. Радыну.

У 1979 годзе на базе мехмата БДУ была праведзена Усесаюзная геаметрычная канферэнцыя з удзелам замежных вучоных.

Вялікая ўвага надавалася навукова-педагагічнай рабоце. Толькі за 3 гады было выдадзена 11 навучальных дапаможнікаў.

Вялікую ролю ў жыцці факультэта адыгрывалі студэнцкія грамадскія арганізацыі: камсамольская, прафсаюзная, студэнцкае навуковае таварыства. Сур'ёзнай праверкай стойкасці духа і сапраўднай школай мужнасці былі студэнцкія будаўнічыя атрады. Ад Камчаткі да Буга, ад Варкуты да Газлі будавалі дамы студэнты нашага факультэта. У год 60-годдзя Ленінскага камсамола быў створаны Камуністычны студэнцкі будаўнічы атрад, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі дзевяці ВНУ Беларусі і Пскоўскай вобласці. Камандзірам атрада быў прызначаны сакратар камітэта камсамола механіка-матэматычнага факультэта Аляксандр Казулін. Атрад пабудаваў мемарыяльны комплекс на месцы гібелі Героя Савецкага Саюза Аляксандра Матросава.

ФПМ — дзіця мехмата

Прафесар Аляксей Адамавіч Гусак з 1963 па 1974 год быў дэканам матэматычнага факультэта БДУ. Пасаду рэктара ў той час (да 1972 года) займаў акадэмік АН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі БССР, Герой Сацыялістычнай працы А. М. Сеўчанка. Дзякуючы вялікаму аўтарытэту і настойлівасці Антона Мікіфаравіча, БДУ ў той час інтэнсіўна развіваўся. А разам з ім і мехмат:

— Па ініцыятыве рэктара для працы ў БДУ на матэматычным факультэце былі запрошаны вучоныя з іншых гарадоў Саюза: Я. А. Барбашын і Р. Габасаў (з Свярдлоўска), Ю. С. Багданаў (з Ленінграда), В. І. Вядзернікаў (з Горкага), Ф. Д. Гахаў (з Растова), І. А. Прусаў і М. Д. Мартыненка (з Львова).

У 1965 годзе ў два разы быў павялічаны прыём на спецыяльнасць "матэматыка" — на дзённае аддзяленне было прынята 225 чалавек.

У 1966 годзе на факультэце адкрыта кафедра прыкладной матэматыкі, яе ўзначаліў акадэмік Я. А. Барбашын. З гэтага часу пачалася падрыхтоўка кадраў па спецыяльнасці "Прыкладная матэматыка". А ў 1970 годзе на базе трох кафедраў матэматычнага факультэта: прыкладной матэматыкі, вылічальнай матэматыкі і кафедры дыферэнцыйных ураўненняў,— быў арганізаваны факультэт прыкладной матэматыкі.

Студэнты другога-чацвёртага курсаў матэматычнага факультэта, якія спецыялізаваліся па ўказаных кафедрах, былі пераведзеныя на ФПМ.

У той жа час, калі я быў дэканам, па ініцыятыве вучоных факультэта пры БДУ былі праведзены 4 рэспубліканскія канферэнцыі матэматыкаў Беларусі, VI Усесаюзны калёквіум па агульнай алгебры. Матэматыкі БДУ бралі ўдзел у Міжнародным кангрэсе матэматыкаў (Масква, 1966 г.).

Да 1975 года 20 супрацоўнікаў і выпускнікоў матэматычнага факультэта абаранілі доктарскія дысертацыі.

Многія былі ўшанаваны прэміямі рэспубліканскага і саюзнага значэння: прэміяй Ленінскага камсамола — У. П. Платонаў, Э. В. Кавалевіч, М. Я. Неменман, М. В. Шкут; Дзяржаўнай прэміяй БССР — Я. І. Велясько, Д. А. Супруненка, Дзяржаўнай прэміяй СССР — Я. А. Барбашын.

У мэтах адпаведных дагавораў паміж БДУ і універсітэтамі іншых краін матэматыкі факультэта падтрымлівалі навуковае і вытворчае супрацоўніцтва з калегамі Йенскага, Сафійскага, Люблінскага, Ягелонскага універсітэтаў.

Акрамя таго, матэматычны факультэт рыхтаваў кадры і для іншых краін: да 1975 года дыпломы БДУ атрымалі 77 замежных грамадзян (В'етнам, Куба, Ліван, Танзанія, Йемен, ЦАР і інш.), 11 з іх абаранілі кандыдацкія дысертацыі ў БДУ.

ФАКУЛЬТЭТ МЯНЯЎСЯ НА ВАЧАХ

Леанід Платонавіч Прымачук, дэкан механіка-матэматычнага факультэта з 1985 па 1996 год. За гэты час на ММФ адбылося шмат значных падзей, пра якія ён і распавядае:

— Напрыклад, у 1986 годзе быў адноўлены набор на аддзяленне механікі і адкрытыя новыя спецыялізацыі па гэтай спецыяльнасці, адкрыта аддзяленне матэматычнай электронікі. У 1988 годзе пачала працаваць кафедра матэматычных метадаў тэорыі кіравання. Праз тры гады — кафедра агульнай матэматыкі і інфарматыкі. Акрамя таго, за гэты час было арганізавана некалькі лабараторый: вучэбная лабараторыя праграмнага забеспячэння вылічальнай тэхнікі, навуковая лабараторыя прыкладных метадаў матэматычнага аналізу пры кафедры тэорыі функцый. Пасля такія лабараторыі былі адкрытыя практычна пры ўсіх кафедрах. Адкрылася новая спецыялізацыя — "матэматычная эканоміка" для студэнтаў 3-5 курсаў. Узнавіўся набор у студэнцкія групы па замежных мовах, выпускнікі якіх атрымлівалі дадатковую кваліфікацыю на права працы, звязанай з замежнай мовай.

ТРАДЫЦЫІ

ДЫНАСТЫЯ МАТЭМАТЫКАЎ

Загадчык кафедры тэорыі функцый доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Эдмунд Іванавіч Звяровіч працуе на мехмаце са жніўня 1975 года. Якраз тады было адкрыта аддзяленне механікі і факультэт стаў называцца механіка-матэматычным:

— Гэта быў цяжкі перыяд, звязаны з нядаўнім хваравітым працэсам выдзялення новага факультэта (прыкладной матэматыкі). Дастаткова прыгадаць, што на мехмаце засталіся ўсяго чатыры штатныя прафесары, а колькасць студэнтаў рэзка ўзрасла.

Трэба было неадкладна пачынаць работу па ўдасканаленню методыкі выкладання асноўных матэматычных дысцыплін. Ніхто, да таго ж, не вызваляў факультэт ад абавязкаў забяспечваць функцыянаванне традыцыйных навуковых школ, не прыгадваючы ўжо аб адкрыцці новых аддзяленняў і спецыялізацый. Сёння можна адзначыць, што ўсе гэтыя праблемы супрацоўнікі пераадолелі больш чым паспяхова.

З 1977 года на факультэце дзесяцігоддзе дзейнічаў факультэцкі метадычны семінар, на якім выпрацоўвалася методыка выкладання матэматычных дысцыплін у новых умовах.

На факультэце па-ранейшаму функцыянавалі традыцыйныя і адкрываліся новыя навуковыя школы. Толькі на нашай кафедры падрыхтаваныя 6 дактароў і больш за 30 кандыдатаў навук.

Па ўзроўню сваёй кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкі састаў факультэта вырас за апошнія 23 гады ў некалькі разоў.

— Нам вядома, што, акрамя 20 кандыдатаў і 2 дактароў навук на факультэце, Вы выхавалі чатырох матэматыкаў ва ўласнай сям'і...

— Так. Мае сыны таксама праявілі схільнасць да матэматыкі. Старэйшыя, Ігар і Вадзім, працуюць дацэнтамі на мехмаце. Ігар заканчвае афармленне доктарскай дысертацыі. Вадзім атрымаў стыпендыю Гумбальта і зараз знаходзіцца ў камандзіроўцы ў г.Аахене (Германія). Сын Аляксей у мінулым годзе закончыў факультэт прыкладной матэматыкі, пасля паступіў у аспірантуру ў Лондан па спецыяльнасці "Даследаванні аперацый". Сын Віктар заканчвае школу і рыхтуецца да паступлення на аддзяленне "Матэматычная электроніка" механіка-матэматычнага факультэта.

СТАРЭЙШЫ СЫН МЕХМАТА

Цяперашні дэкан механіка-матэматычнага факультэта Мікалай Іосіфавіч Юрчук крочыць разам з ММФ з верасня 1961 года, калі стаў яго студэнтам.

Расставаліся яны толькі два разы: у 1970 годзе Мікалай Іосіфавіч быў пераведзены на ФПМ, дзе працаваў 13 гадоў спачатку старшым выкладчыкам, а затым дацэнтам кафедры ўраўненняў матэматычнай фізікі, у 1985 годзе быў абраны сакратаром парткома БДУ. Але на свой факультэт прафесар Юрчук зайсёды вяртаўся: перад абраннем на партыйную работу паспеў два гады папрацаваць дэканам, а з верасня 1996 зноў узначаліў факультэт.

— Вы ведаеце мехмат як студэнт, выкладчык, дэкан і як чалавек, які мог назіраць за жыццём роднага факультэта збоку. Калі ён падабаўся вам больш за ўсё?

— Ён заўсёды прыцягваў мяне і пастаянна змяняўся. За гэтыя гады вырас у якасных адносінах кантынгент выкладчыкаў. Сярод студэнтаў адбылася дыферэнцыяцыя: лепшыя сталі лепшымі, чым былі ў мінулыя часы.

— Але ж Вам як дэкану часцей за ўсё, пэўна, даводзіцца сустракацца з нядобайнымі студэнтамі?

— З нядобайнымі студэнтамі часцей у нас мае справы Уладзімір Васільевіч Суворaў. Мяне ў такіх сітуацыях аберагаюць. Толькі ў надзвычайных выпадках патрабуецца ўмяшальніцтва дэкана. Надзвычайныя здарэнні адбываліся і будуць адбывацца. Гэтай з'явы пазбегнуць не ўдасца, пэўна, ніколі.

— Паколькі Вам выпадае ўсё ж гонар мець справу з выдатнікамі, давайце пагаворым пра універсітэцкую матэматычную школу, якая высока ацэньваецца не толькі на прасторах СНД, але і ў далёкім замежжы...

— Гэта не толькі школы па алгебры і дыферэнцыйных ураўненнях, аб якіх шмат гавораць. Ёсць нямала іншых, якія знаходзяцца, так бы мовіць, пакуль у ценю. Але я правёў бы такую паралель — гэта як у спорце. Адна футбольная каманда моцная сваім нападаючым, а другая — сваёй зладжанасцю. Я лічу, што ў нас вось такая зладжаная каманда матэматыкаў і робяць яны невымерна болей, чым можа зрабіць адна школа.

— У якіх сферах працуюць вашы выпускнікі?

— Цяпер і ў бізнесе, і на вытворчасці, і ў навуцы, і ў банкаўскай сферы. Можна сказаць, што і гэта таксама падштурхоўвае факультэт да перамен. З новага навучальнага года ў нас адбудзецца прыём па наступных спецыяльнасцях і спецыялізацыях: матэматыка — навукова-вытворчае аддзяленне (кваліфікацыя "Матэматык"), матэматыка — навукова-педагагічнае аддзяленне (кваліфікацыя "Матэматык. Выкладчык матэматыкі і інфарматыкі"), механіка (кваліфікацыя "Механік. Матэматык-прыкладнік"), матэматычная электроніка (кваліфікацыя "Матэматык. Матэматык-сістэматэхнік"), камп'ютэрная матэматыка (кваліфікацыя "Матэматык. Матэматык — сістэмны аналітык"), матэматычныя метады ў эканоміцы (кваліфікацыя "Матэматык. Матэматык-эканаміст"). А пачынаў наш факультэт з таго, што быў проста матэматычным і кваліфікацыя прысвойвалася адна — "матэматык". Лепшых студэнтаў у сярэдзіне 60-х гадоў, праўда, пакідалі яшчэ на паўгода вучыцца, і ім у дыплом запісвалася яшчэ і спецыялізацыя. У мяне, напрыклад, напісана "Матэматык са спецыялізацыяй па дыферэнцыйных ураўненнях".

— Вы часта сустракаецеся са сваімі аднакурснікамі?

— Безумоўна. Вось, напрыклад, з прарэктарам па вучэбнай рабоце Віктарам Іванавічам Карзюком, з якім калісьці жыў у інтэрнаце ў адным пакоі, бачымся амаль кожны дзень. Увогуле ва універсітэце працуе каля дзесяці маіх аднакурснікаў.

— Пра матэматычныя дынастыі на Вашым факультэце можна складаць легенды...

— Так. Самы красамоўны прыклад — прафесар Эдмунд Іванавіч Звяровіч і чацвёра яго сыноў. Ёсць і другія дынастыі. Старэйшы сын прафесара Якава Валянцінавіча Радыны — кандыдат навук, працуе ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а малодшы — заканчвае аспірантуру. Дачка прафесара Рэгіны Іосіфаўны Тышкевіч і першага дэкана нашага факультэта акадэміка Дзмітрыя Аляксеевіча Супруненкі, Ірына Дзмітрыеўна Супруненка, — таксама матэматык, доктар фізіка-матэматычных навук... Я лічу, што гэта станоўчая з'ява. Выхаванне ў навуковай хатняй атмасферы спрыяе развіццю матэматычных здольнасцей. Хаця, зразумела, у сем'ях матэматыкаў нараджаюцца і журналісты, а ў філолагаў, здараецца, вырастаюць матэматыкі. У свой час дзеці юрыстаў вучыліся матэматыцы. Цяпер многія дзеці матэматыкаў вучацца на юрфаку. Жыццё ўносіць свае карэктывы. Але той, у каго душа ляжыць да матэматыкі, незалежна ад кан'юнктуры застаецца матэматыкам.

— Толькі Вы ведаеце, што чакае факультэт у будучым...

— Я думаю, што пакуль факультэт будзе знаходзіцца на трэцім-чацвёртым паверхах галоўнага корпуса. Набор будзе адбывацца ў рамках традыцыйнага, але спецыялізацый будзе болей. Раней мы вывучалі матэматыку і яе дадаткі ў фізіцы, механіцы, тэхніцы. Цяпер жыццё патрабуе вывучаць такасама дадаткі матэматыкі, скажам, у эканоміцы. Увогуле я пажадаў бы роднаму факультэту адсвяткаваць яшчэ не адзін юбілей.

НА ЗДЫМКУ: студэнт Мікалай ЮРЧУК

СТАРАЖЫЛЫ

ПАТРЫЯРХ ГЕАМЕТРЫЧНАЙ НАВУКІ

Найбольш старажытнай матэматычнай дысцыплінай з'яўляецца геаметрыя. Доўгі перыяд у гісторыі чалавецтва ўсіх матэматыкаў называлі геаметрамі. Таму няма нічога дзіўнага, што найстарэйшым з навуковых семінараў факультэта з'яўляецца геаметрычны, створаны напрыканцы 50-х гадоў. Заснавальнік гэтага семінара дацэнт Леанід Кандратавіч Тутаеў, уступаючы ў сваю 95 вясну, нядаўна зрабіў заяўку на чарговы навуковы даклад...

У тыя далёкія гады загадчык кафедры геаметрыі Л. К. Тутаеў, актыўна стымулюючы навуковыя даследаванні маладых супрацоўнікаў, запрашаў на семінар вядомых спецыялістаў з буйных навуковых цэнтраў краіны. Пачатак бурлівага росту геаметрычнай навукі ў рэспубліцы адзначыўся на заканчэнні 60-х гадоў. Тады ў Мінск быў запрошаны адзін з вядучых спецыялістаў па сучаснай дыферэнцыйнай геаметрыі прафесар В. І. Вядзернікаў. З таго часу на геаметрычным семінары была поўнасцю прадстаўлена сучасная геаметрыя ў яе шматлікіх сувязях з алгебра-тапалагічнымі тэорыямі і метадамі сучаснага глабальнага аналізу і дыферэнцыйных ураўненняў, а таксама дадаткамі ў тэарэтычнай фізіцы. На семінары выступілі практычна ўсе самыя вядомыя геаметры нашай краіны і многіх еўрапейскіх дзяржаў. Пасля смерці В. І. Вядзернікава ў 1991 годзе яго імя было нададзена геаметрычнаму семінару.

Добрыя традыцыі жывуць доўга. Цяперашнія ўдзельнікі семінара, які зараз узначальвае прафесар В І. Янчэўскі, не стамляюцца захапляцца той адданасцю навуцы і чысцінёй думак, якія зыходзяць ад цудоўнага чалавека — Леаніда Кандратавіча Тутаева. Ён — выдатны прыклад не толькі для маладых, але і для многіх ветэранаў матэматычнай навукі.

В. БАЛАШЧАНКА, член Бюро геаметрычнага семінара імя В. І. Вядзернікава, дацэнт механіка-матэматычнага факультэта

ЧАМУ НАС ВУЧАЦЬ МАТЭМАТЫКІ?

Васіль Пятровіч ВАРАБ'ЁЎ,
дэкан факультэта журналістыкі:

— Васіль Пятровіч, ці любілі Вы ў школе матэматыку?

— Матэматыку я вельмі любіў. Нават прымаў актыўны ўдзел у абласных і рэспубліканскіх алімпіядах па матэматыцы. Чаму ж не пайшоў у матэматыкі? Ведаеце, душа ўсё ж цягнулася да слова, і журналістыка перамагла. Але матэматыка мне вельмі дапамагае ў жыцці — яна вучыць думаць лагічна, стройна, сістэмна. А аб'ядноўвае матэматыку і журналістыку, на маю думку, тое, што гэтыя навукі вельмі цікавыя і патрэбныя для грамадства.

Аляксандр Віктаравіч ШАРАПА,
дэкан факультэта міжнародных адносін:

— Аляксандр Віктаравіч, ці можна вылучыць нейкія агульныя якасці, якія аб'ядноўваюць усіх матэматыкаў?

— Я лічу, што такія якасці ёсць. Напрыклад, канкрэтнасць. Матэматыкі не любяць шмат гаварыць. Дарэчы, я сам калісьці скончыў фізіка-матэматычны факультэт педагагічнага інстытута. І ў школе не меў ніколі троек па матэматыцы.

А яшчэ матэматыкі вылучаюцца дакладным падыходам да вырашэння якой-небудзь праблемы. Вось гэтаму ў іх можна павучыцца.

Анатоль Ізотавіч ЗЕЛЯНКОЎ,
дэкан філасофска-эканамічнага факультэта:

— Анатоль Ізотавіч, што, на Ваш погляд, агульнага паміж матэматыкай і філасофіяй?

— Філасофія і матэматыка яшчэ са старажытных часоў вельмі цесна ўзаемазвязаныя. І да гэтага часу нікому не ўдалося іх разарваць. Што ў іх агульнага? І матэматыка, і філасофія генеруюць абстрактную карціну свету. Матэматычная абстрактная карціна свету часам прыносіць карысць. Філасофская ж вельмі рэдка бывае ўжытковай, але пры гэтым яна выклікае пачуццё хвалявання і любові. А матэматычная — пачуццё хвалявання і страху.

Але насуперак гэтаму хачу паважадаць, каб паміж матэматыкамі і філосафамі, і з аднаго і з другога боку, пачуццё хвалявання і страху знікала, а заставалася любоў.

СТУДЭНЦКАЯ КАР'ЕРА

Юрый Нікулін — яскравы прыклад таго, як можна распачаць будаваць кар'еру яшчэ ў студэнцкія гады. Тое, што Юрый вучыцца на "выдатна", пачынаючы з першай сесіі, не перашкаджае яму ўзначальваць зборную мехмата па шахматах. Бліскучыя выступленні нашай зборнай на спаборніцтвах універсітэта паказваюць, што І разрад па шахматах належыць студэнту Нікуліну па праву. Здавалася б, спаборніцтвы і трэніроўкі не пакідаюць часу ні на што іншае. Аднак звычайная курсавая работа студэнта перарасла ў навуковы артыкул. Аб атрыманых выніках Нікулін дакладваў на Міждзяржаўным семінары па дыскрэтнай матэматыцы ў МДУ. Не кожны можа пахваліцца такімі навуковымі поспехамі, хаця ўсе студэнты першапачаткова знаходзяцца ў роўных умовах. Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што Нікулін з'яўляецца стыпендыятам імя Ф. Скарыны.

Можа з упэўненасцю сцвярджаць, што Юрыю не пагражае лёс многіх выпускнікоў ВНУ, якія працуюць не па спецыяльнасці і наракаюць на сістэму адукацыі, дрэнных выкладчыкаў, няўдалае размеркаванне. Нікулін пасля заканчэння універсітэта апынецца ў ліку тых, хто сам выбірае, не чакаючы, пакуль выбяруць яго.

АЎТАР СТА ЗАДАЧ

Дзмітрый Базылеў быў залічаны студэнтам БДУ без уступных экзаменаў. А ўжо на трэцім курсе выдаў уласную кнігу "100 алімпіядных задач па матэматыцы", у якую ўвайшлі аўтарскія задачы, многія з якіх былі прадстаўлены на раённых, гарадскіх, рэспубліканскіх алімпіядах.

Да таго ж, Дзмітрый неаднаразова з'яўляўся членам журы на школьных матэматычных канферэнцыях, турнірах, алімпіядах, працаваў з групай дзяцей у летняй рэспубліканскай навукова-даследчай школе "Лужасна". Праводзіць праблемны семінар для старшакласнікаў і студэнтаў БДУ на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі па даследаваннях дыяфантавых ураўненняў. Адзначым, што два чалавекі, якія займаліся на семінары, удзельнічалі ў школьнай навукова-даследчай канферэнцыі і былі ўзнагароджаны дыпломам II ступені.

У ЗАХАПЛЕННІ АД МАТЭМАТЫКІ

Станіслаў Суздаль вучыцца на 4-м курсе навукова-вытворчага аддзялення механіка-матэматычнага факультэта БДУ.

Станіслаў неаднаразова быў пераможцам матэматычных алімпіяд. Школу скончыў з залатым медалём. Паколькі школьная праграма не ўяўляла для яго ніякай складанасці, Станіслаў дадаткова займаўся ў завочных фізіка-матэматычных школах пры БДУ, МДУ, МФТІ.

Але па-сапраўднаму многія матэматычныя здольнасці праявіліся ва універсітэце. Усе сесіі — выключна на "выдатна". З пачатку навучання ў БДУ займаецца тэорыяй графаў пад кіраўніцтвам доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара кафедры ўраўненняў матэматычнай фізікі Р. І. Тышкевіч. Станіслаў ужо мае дзве навуковыя працы, адна з якіх выходзіць у бліжэйшым нумары часопіса "Весці НАН Беларусі". Акрамя таго, ягоны даклад быў прызнаны ў ліку лепшых на Рэспубліканскай студэнцкай канферэнцыі 1997 года.

Цяпер Станіслаў з'яўляецца сувыканаўцам планавай дзяржбюджэтнай НДП 1.1.16. "Структурны аналіз графаў, гіперграфаў і булевых функцый". А ў гэтым семестры ён узнагароджаны стыпендыяй імя Ф. Скарыны.

ВЫДАТНЫЯ ВЕДЫ ЗАЎСЁДЫ АКУПЛЯЮЦЦА

Генеральным спонсарам святкавання Дней ММФ-98 шырока вядомая кампанія "Белсофт" выступіла зусім не выпадкова. Ля вытокаў кампаніі, якая ў гэтым годзе таксама адзначыла невялікі юбілей — 5 гадоў з дня заснавання, стаялі выпускнікі мехмата. Займаючыся поўным спектрам рашэнняў у галіне праектавання, пабудовы, абслугоўвання і мадэрнізацыі камп'ютэрных і тэлефонных сетак любога памеру і складанасці, "Белсофт" дасягнула значных поспехаў у гэтай сферы. На сённяшні дзень "Белсофт" паспяхова рэалізавала больш за сто буйных праектаў.

— Чым адрозніваецца "Белсофт" ад іншых кампаній?

Леанід Качура, тэхнічны дырэктар:

— Галоўнае адрозненне ў тым, што мы "прывязваемся" да тэхналогій, а не да фірмаўвытворцаў і прапаноўваем рашэнні на базе абсталявання розных фірм. Дарэчы, "Белсофт" — выключна беларуская фірма. Мы не карыстаемся паслугамі заходніх спецыялістаў, навучаем уласных і самі засвойваем новыя тэхналогіі. Самі ж нясем адказнасць за рэалізаваныя праекты. У нас выхавалі моцныя патрыятычныя прыхільнасці, у тым ліку, і да роднага факультэта. Інакш мы б даўно ўжо працавалі за мяжой.

— Вы закончылі мехмат. Ці сустракаецеся зараз з аднакурснікамі?

Леанід Качура:

— Так. Напрыклад, сустракаеш сяброў у Берліне і застаешся ў іх начаваць. Сустракаемся, калі ёсць агульная справа, а выпадкова — на Днях мехмата. Калі працуем у адным накірунку, рана ці позна бачым адзін аднаго на выставах і тэндэрах.

— Як паўплывала на ваш лёс матэматычная адукацыя?

Алег Дашэвіч, выканаўчы дырэктар:

— Мы атрымалі фундаментальныя веды, якія дазваляюць адчуваць сябе ўпэўнена ў любой сітуацыі. Калі цябе навучылі думаць, абавязкова рызбярэшся ва ўсім.

Леанід Качура:

— Мехмат выпрацаваў сістэмны падыход у рашэнні задач, уменне працаваць.

— Што б вы параілі сённяшнім студэнтам?

Алег Дашэвіч:

— Я б на іх месцы не імкнуўся зарабіць 100 долараў у месяц у якой-небудзь фірме, а імкнуўся б атрымаць тэарэтычныя і прыкладныя веды. А яшчэ напрацаваць практыку. Я б пажадаў выдатных ведаў. Гэтая рэч заўсёды акупляецца.

Леанід Качура:

— Вывучайце дадаткі да матэматыкі і механікі. Гэта спатрэбіцца. Англійская мова — таксама.

Вольга СТАГУРАВА

МЕХМАТАВЕЦ МОЖА ВУЧЫЦЦА Ў ЛЮБЫМ УЗРОСЦЕ

Выпускнікоў мехмата можна назваць універсальнымі спецыялістамі. Яны працуюць ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці, дзе неабходна кемлівасць і дзелавая хватка, напорыстасць і ўменне валодаць сабой, фундаментальныя веды тэорыі і практычны вопыт. Апрача таго, гэтыя людзі — сапраўдныя патрыёты свайго факультэта.

Напярэдадні юбілею факультэта мы вырашылі пазнаёміць студэнтаў з тымі, хто ўжо дамогся высокіх вынікаў у жыцці і з гонарам носіць званне выпускніка механіка-матэматычнага факультэта. Наш карэспандэнт сустрэўся з Віктарам Дзмітрыевічам Бабарыкам, начальнікам аддзела інвестыцый банка "Алімп", і Яўгенам Анатольевічам Свірскім, выканаўчым дырэктарам банка "Алімп", кандыдатам фізіка-матэматычных навук. Менавіта камерцыйны банк "Алімп" выступаў галоўным спонсарам дзён мехмата ў 1997 годзе.

— Як атрымалася, што, скончыўшы механіка-матэматычны факультэт БДУ, вы працуеце ў зусім іншай галіне?

В. Бабарыка: Радзіма сказала: "Трэба!" (Смяецца.) Хаця я адпрацаваў шэсць з паловай гадоў у МВА "Парашковая металургія" інжынерам, малодшым навуковым супрацоўнікам, навуковым супрацоўнікам. Потым паводле таго ж закліку за два месяцы давялося вывучыць знешнеэканамічную дзейнасць, а крыху пазней — і банкаўскую справу.

Я. Свірскі: Я таксама не адразу аказаўся звязаны з банкаўскай сістэмай. Пасля заканчэння аспірантуры 20 гадоў працаваў ва універсітэце ў вылічальным цэнтры, загадваў навукова-даследчай лабараторыяй. Аднак з распадам Саюза спынілася фінансаванне і давялося мяняць профіль працы. З 1993 года па 1995 працаваў у АКБ "Беларусбанк", і трэба зазначыць, што рашэнне аб змене працы прымалася з цяжкасцю. А з 1995 года я працую ў "Алімпе".

— Аказваецца, вы майстры на ўсе рукі. А ці адрозніваеце што-небудзь выпускніка мехмата ад іншых людзей, якія атрымалі вышэйшую адукацыю?

В. Бабарыка: Універсітэт (нават можна сказаць, толькі мехмат) надзяляе студэнтаў велізарным патэнцыялам ведаў і закладвае ў іх уменне вучыцца. Усякі матэматык зможа за два месяцы вывучыць усю спецыфіку працы бухгалтара, эканаміста і г.д. Але ніякі бухгалтар не зможа выконваць працу інжынера, калі ён, вядома, не матэматычны геній. Ёсць дакладная сістэма засвойвання новых ведаў, паняццяў. Матэматык можа вучыцца ў любым узросце.

Рэктар Белдзяржуніверсітэта Аляксандр Уладзіслававіч Казулін таксама калісьці вучыўся на мехмаце. І быў сакратаром камсамольскай арганізацыі. Як сведчаць тагачасныя фотаздымкі, Аляксандр Уладзіслававіч актыўна ўдзельнічаў у жыцці факультэта.

Я. Свірскі: У людзей, якія скончылі мехмат, ёсць надзвычайнае адчуванне лічбы. Яна для іх не проста гук, а нешта адчувальнае. І гэтае адчуванне нараджае імкненне падыходзіць да кожнага факта аналітычна. Увогуле, гэта вельмі адукаваныя людзі. Універсітэт дае ўсебаковае развіццё асобы.

— А як вы паступілі на механіка-матэматычны факультэт: выпадкова ці мэтанакіравана?

Я. Свірскі: Можна сказаць, што мэтанакіравана. Мне ў школе лёгка даваліся і хімія, і матэматыка, і фізіка. Але падумаўшы, я вырашыў, што калі стаць добрым матэматыкам, то будзеш і ў фізіцы разбірацца, і ў хіміі. А паступіў я на факультэт, калі ён яшчэ не быў падзелены на два факультэты. І спецыялізаваўся на кафедры тэарэтычнай механікі.

В. Бабарыка: Я паступаў па шляху найбольшага супраціўлення. Тады, у 1982 годзе, на факультэце быў набор па трох аддзяленнях: вытворчасць, педагогіка, механіка. На вытворчасць і педагагічнае аддзяленне набіралася па 150 чалавек, а на механіку — 25, і быў вялікі конкурс. Каб паступіць туды, трэба было пастарацца. Гэтае аддзяленне лічылася элітай, і я адразу вырашыў, што менавіта гэта мне і трэба.

— Скончыўшы аддзяленне механікі, вы не шкадуеце пра гэта?

Я. Свірскі: Адзінае, пра што шкадую, дык пра тое, што ў студэнцкія гады мала часу аддаваў навучанню. Потым даводзілася самому наганяць. Разумееш, што час страчаны, калі ўжо позна штосьці вяртаць. Але студэнцтва — гэта самы вясёлы час у жыцці! Дагэтуль засталася перакананасць, што кожную задачу можна рашыць за пяць дзён, як падрыхтавацца да складанага іспыту.

В. Бабарыка: Не шкадую! Механіка — прыкладная навука, і каб добра ў ёй разбірацца, неабходна дасканала ведаць алгебру, геаметрыю, дыферэнцыйныя ўраўненні, інтэгральнае вылічэнне, — зрэшты ўсё, чаму навучаюць на мехмаце. Механік (у сэнсе, той, хто скончыў аддзяленне механікі) — універсальны матэматык, ён можа рашыць любую задачу. А ўвогуле я разумеў, што ёсць вострая неабходнасць атрымаць веды.

— Вы сустракаецеся са сваімі аднакурснікамі?

В. Бабарыка: Сустракаемся — і па працы, і проста так, як атрымліваецца.

Я. Свірскі: На жаль, чым старэйшы курс, тым больш тонкія сувязі паміж выпускнікамі, тым радзейшыя сустрэчы. Вельмі шкада, што студэнты не ведаюць гісторыі свайго факультэта, дый факультэт з цягам часу адкідае сваіх выпускнікоў. Сувязь падтрымліваецца пераважна праз выкладчыкаў.

Вольга КРЫЦКАЯ

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты - БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана на паліграфічнай фабрыцы "Чырвоная зорка" ВПП імя Я. Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны завул., 3
Ум. друк. арк. 1
Падпісана ў друк у 12.00

9 КРАСАВІКА
Зак. 1434
Т. 1000 экз.
Бясплатна

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Камп'ютэрная вёрстка Крывадубскай А.